*УДК 94(476) В. Караткевіч*

***Н. В. Барабаш,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў БДПУ*

# В. КАРАТКЕВІЧ – ПАРТЫЗАНСКІ ПАДПАЛКОЎНІК

Студэнты Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М. Горкага і, у прыватнасці, гістарычнага факультэта, актыўна ўдзельнічалі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў радах партызан. Дадзены артыкул прысвечаны аднаму з вядомых арганізатараў і кіраўнікоў падпольнага і партызанскага руху у Палескай вобласці, студэнту 3-га курса гістфака *Васілю Афанасьевічу Караткевічу*.

В. А. Караткевіч нарадзіўся ў 1909 г. у в. Вішар Калінкавіцкага раёна Палескай вобласці ў сям'і селяніна-бедняка. Васіль заўсёды марыў стаць педагогам і паступова яго мары пачалі здзяйсняцца. Пасля заканчэння ў 1928 г. сярэдняй школы ён паступае на вучобу ў Мінскі педагагічны тэхнікум на дзённае аддзяленне. Энергічнага, здольнага студэнта ў 1930 г. у ліку 9-ці лепшых студэнтаў накіроўваюць на працу ў Уздзенскі раён, дзе не хапала настаўнікаў. Яго адразу ж прызначаюць загадчыкам няпоўнай сярэдняй школы, дзе ён і прапрацаваў да 19 мая 1931 г. Потым ён зноў вяртаецца на вучобу ў педагагічны тэхнікум і паспяхова заканчвае яго ў 1931 г. Далейшы яго шлях быў звязаны з працай настаўнікам, дырэктарам шэрагу школ Уздзенскага і Мінскага раёнаў.

У 1938 г. ён паступае на дзённае аддзяленне гістарычнага факультэта Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага і, падавалася б, нішто не перашкодзіць яму паспяхова атрымаць вышэйшую адукацыю. Аднак лёс распарадзіўся паіншаму. Ён паспеў скончыць толькі тры курсы гістарычнага факультэта. У верасні 1939 г. адбываецца аб'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. У 1940 г. яго пераводзяць на завочнае аддзяленне і накіроўваюць на працу дырэктарам сярэдняй школы ў мястэчка Ляхавічы Баранавіцкай вобласці, дзе ён і працаваў да пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

Пачатак Вялікай Айчыннай вайны кардынальна змяніў жыццё краіны і асабістае жыццё настаўніка. Педагога, які ніколі не быў звязаны з ваеннай службай, у канцы чэрвеня 1941 г. прызываюць у Чырвоную Армію і накіроўваюць на кароткатэрміновыя курсы палітрукоў у Смаленск, дзе яго застае вайна. У званні палітрука ён змагаецца ў 6-й стралковай дывізіі 84-га стралковага палка Цэнтральнага фронту. Літаральна з першых дзён вайны, В. Караткевіч пачаў барацьбу з ворагам, якая працягвалася доўгія чатыры гады. У 1941 г. разам з тысячамі салдат ён пазнаў цяжкія баі, горыч адступлення, акружэння і адно з самых страшных выпрабаванняў – палон. У палон В. Караткевіч трапіў пад Смаленскам падчас абарончых баёў 5 верасня 1941 г. Аднак ужо 7 верасня ён здзяйсняе ўдалы ўцёк з палону і цэлы месяц – галоўным чынам начамі, прабіраецца з-пад Смаленска дамоў, у в. Буда Калінкавіцкага раёна Палескай вобласці [1, арк. 310 адв.].

Для камуніста В. Караткевіча, а ў партыі ён з 1938 г., не паўставала пытанне, што рабіць? Ён адразу ж далучаецца да падпольнай групы пад кіраўніцтвам К. Бакуна, якая была арганізавана ў Калінкавічах у першыя месяцы вайны.

З 1941 г. група збірала зброю і боепрыпасы, займалася дыверсіямі і зборам інфармацыі аб войсках праціўніка, распаўсюджвала сярод насельніцтва звесткі пра становішча на франтах. Аднак галоўнай задачай групы стала падрыхтоўка да стварэння партызанскага атрада [2, с. 253]. Праведзеная праца забяспечыла поспех, а падпольная група, актыўным удзельнікам якой быў В. Караткевіч, стала ядром партызанскага атрада імя Варашылава, створанага ў чэрвені 1942 г.

З гэтага часу пачынаецца новы этап у жыцці і барацьбе В. Караткевіча супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1942–1944 гг. у час камандавання партызанскім атрадам, а потым брыгадай найбольш яскрава праявіўся яго герапізм, вайсковы талент. Наколькі быў высокі аўтарытэт В. Караткевіча як арганізатара, бясстрашнага камандзіра сярод сваіх баявых таварышаў, сведчыць той факт, што пры арганізацыі партызанскага атрада яго адразу ж выбіраюць начальнікам штаба, потым камісарам, а з чэрвеня 1943 г. – камандзірам 99-й Калінкавіцкай брыгады, ядром якой з'яўляўся атрад імя Варашылава. В. Караткевіч поўнасцю апраўдвае надзеі і давер таварышаў.

Як начальнік штаба ён удзельнічае ў распрацоўцы ўсіх баявых аперацый супраць захопнікаў. Удумлівасць, увага літаральна да кожнай дробязі пры планаванні аперацый, садзейнічалі іх паспяховаму ажыццяўленню. У справаздачы камандавання партызанскага атрада імя Варашылава аб баявой дзейнасці адзначалася: «Атрад быў арганізаваны летам 1942 г. у Калінкавіцкім раёне. Падрыхтоўчая праца па арганізацыі атрада была пачата з лістапада 1941 г. Капітанам К. М. Бакуном і Дз'ячэнка была ўстаноўлена сувязь з атрадам Міхайлоўскага. Пасля гэтага прыступілі да пошуку зброі. Да пачатку сакавіка 1942 г. неабходная зброя была ўзята на ўлік і захаванне, а таксама была створана арганізацыйная пяцёрка, у склад якой уваходзілі Бакун, Дз'ячэнка, Лаеўскі, *Караткевіч* (выдзелена мной. – *Н. Б.*), Грыгор'еў. Да моманта выхаду ў лес (16 мая 1942 г.) у атрадзе налічвалася 17 чал., якія і склалі ядро атрада» [2, с. 296]. Пасля стварэння, атрад адразу ж распачаў

Рэпазіторый БДПУ

актыўную баявую дзейнасць. Так, «23 чэрвеня 1942 г. на дарозе Юравічы–Калінкавічы, каля вёскі Слабодка была ўзарвана грузавая аўтамашына. Забіта і паранена немцаў і паліцэйскіх 12 чалавек. […] 13 ліпеня 1942 г. на чыгунцы Калінкавічы–Гомель, у раёне Крывой, спушчаны пад адхон воінскі эшалон з людскім саставам. Амаль поўнасцю знішчаны мадз'ярскі дывізіён. Рух быў прыпынены на 3 сутак [2, с. 296].

Актыўная баявая дзейнасць атрада імя Варашылава была заўважана і адзначана нават на саюзным узроўні. У красавіку 1943 г. у паведамленні Саўінфармбюро адзначалася: «Партызанскі атрад імя Варашылава, які дзейнічае ў адным з раёнаў Палескай вобласці, на працягу сакавіка пусціў пад адхон 5 воінскіх эшалонаў праціўніка, якія накіроўваліся да лініі фронту. Група партызан гэтага атрада разграміла нямецка-паліцэйскі ўчастак. Знішчана 23 гітлераўцы, астатнія, кінуўшы зброю, разбегліся. Партызанамі захоплены кулямет, 32 вінтоўкі, многа гранат і патронаў» [2, с. 303].

Адна з важнейшых форм партызанскай барацьбы – гэта знішчэнне камунікацый праціўніка. 99-я Калінкавіцкая брыгада пад камандаваннем падпалкоўніка В. Караткевіча вельмі актыўна і паспяхова вяла «рэйкавую вайну». Імперская служба руху і галоўная дыспетчарская служба чыгункі Генеральнага камісарыята «Беларусь» 8 кастрычніка 1943 г. паведамляла свайму кіраўніцтву, што «адпраўка цягнікоў з Гомеля і Лунінца ў напрамку Калінкавіч ускладнена ў сувязі з партызанскай дзейнасцю. 8 кастрычніка чыгуначныя дарогі была закрыты для руху на лініях: Лунінец–Калінкавічы на 17 гадзін, Калінкавічы–Гомель на 19 гадзін. На гэтай лініі закрыты на 15 гадзін рух на ўчастку паміж Кацурамі і Клінскам. На 422-м кіламетры падарваўся таварна-пасажырскі цягнік. 10 вагонаў зышлі з рэек» [2, с. 280].

Вораг не меў спакою і не адчуваў сябе ў небяспецы і на водных камунікацыях. Вось што паведамляў камбрыг В. Караткевіч у штаб Палескага партызанскага злучэння ў кастрычніку 1943 г.: «99-я брыгада ў раёне Тульгавіч на рацэ Прыпяць абстраляла нямецкі параход грузапад'ёмнасцю 100 т, які рухаўся з Кіева ў Мазыр. У выніку абстрэлу параход быў моцна пашкоджаны, праплыў 2 км па рацэ і прычаліў да берага, пасля чаго быў ўзяты на буксір бранякатарам, падыйшоўшым з Мазыра. У выніку абстрэлу былі забітыя тры нямецкія салдаты. Рух па рацэ быў спынены. […] 12.09.1943 г. група байцоў пры садзейнічанні сувязных знішчыла пераправу на рацэ Прыпяць. Быў спушчаны паром па цячэнні на 3 км, пасля чаго затоплены» [3, арк. 188]. Спробы немцаў узяць пад кантроль і выкарыстаць р. Прыпяць як дапаможную магістраль для перавозкі грузаў, жывой сілы, зброі і г. д. не мелі поспеху, бо на ўчастку дзейнасці 99- й Калінкавіцкай брыгады яна поўнасцю кантралявалася партызанамі

Умелае камандаванне атрадам, асабістая мужнасць, адвага В. Караткевіча ў баявых аперацыях адлюстравана ў яго баявой характарыстыцы: «Тав. Караткевіч у партызанах з чэрвеня 1942 г. З'яўляецца адным з арганізатараў партызанскага руху ў Калінкавіцкім раёне. З моманту арганізацыі атрада тав. Караткевіч працаваў начальнікам штаба атрада, у лютым камісарам атрада, а ў чэрвені прызначана камандзірам брыгады. Пад яго кіраўніцтвам за кароткі час атрад вырас ў брыгаду, у якую ўваходзіла 6 добраўзброеных і шматлікіх партызанскіх атрадаў. Тав. Караткевіч смелы, рашучы, настойлівы і ініцыятыўны камандзір» [1, арк. 319–320].

Радзіма высока ацаніла баявыя подзвігі В. Караткевіча. Першую сваю баявую ўзнагароду ён атрымаў ў кастрычніку 1943 г. У наградным лісце адзначалася: «Т. Караткевіч В. А. знаходзіўся ў партызанскім атрадзе са снежня 1941 г. Прымаў непасрэдны ўдзел у арганізацыі атрада. З пачатку арганізацыі атрада працаваў партарганізатарам, са студзеня 1943 г. працуе камісарам атрада. За перыяд работы камісарам дыверсійнымі групамі атрада пушчаны пад адхон чатыры воінскія эшалоны праціўніка. Кіраваў аперацыямі па разгроме нямецка-паліцэйскіх гарнізонаў у Ліпаўцы і Давыдаўцы. Т. Караткевіч арганізаваў партыйна-камсамольскія падпольныя камітэты ў Калінкавічах» [4, арк. 126].

Да наступнай узнагароды – «Партызану Айчыннай вайны» 2-й ступені, адзначалася: «Тав. Караткевіч са студзеня 1942 па 16 студзеня 1944 г. знаходзіўся ў партызанскім атрадзе імя Варашылава і актыўна прымаў удзел у арганізацыі партызанскага атрада. За два гады работы ў партызанскіх атрадах: сакратар партарганізацыі атрада, камісар атрада, камісар брыгады, а ў апошні час сакратар Калінкавіцкага падпольнага райкама партыі. За перыяд работы ў партызанскіх атрадах тав. Караткевіч праявіў сябе толькі са станоўчага боку як арганізатар партызанскага атрада і як кіраўнік, удзельнік многіх баёў па разгроме нямецка-паліцэйскіх гарнізонаў. Асабіста сам т. Караткевіч удзельнічаў у падрыве некалькіх варожых эшалонаў» [5, арк. 55].

У якасці камбрыга 99-й Калінкавіцкай партызанскай брыгады найбольш яскрава праявіўся ваенны талент В. Караткевіча. За ўмелае кіраванне брыгадай, паспяховую арганізацыю і правядзенне баявых аперацый у 1943 г. яго двойчы прадстаўляюць да чарговых воінскіх званняў. У маі 1943 г. яго прадстаўляюць да воінскага звання – маёр [1, арк. 312], а ў снежні гэтага ж года – падпалкоўнік. У атэстацыйным лісце, падпісаным начальнікам Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР) П. Калініным, адзначалася: «Партызанскай брыгадай т. Караткевіч камандуе з 1 мая 1943 г. У склад яго брыгады ўваходзіць 5 атрадаў, агульнай колькасцю 673 чал. За апошнія 5 месяцаў брыгадай пушчана пад адхон 29 воінскіх эшалонаў праціўніка. Узарвана 2 чугуначныя масты і 22 масты на шашэй-

Рэпазіторый БДПУ

ных і грунтавых дарогах. Знішчана 27 аўтамашын. Пры абстрэлах эшалонаў праціўніка пашкоджана 11 цягнікоў. У час правядзення «рэйкавай вайны» падарвана 2220 чыгуначных рэек. У баях і засадах забіта 900 нямецкіх салдат і афіцэраў. Т. Караткевіч смелы і знаходлівы камандзір. У складаных сітуацыях прымае правільныя рашэнні. Усе аперацыі, якія былі праведзеныя брыгадай, завяршаліся паспяхова. Як камандзір брыгады з работай спраўляецца паспяхова. Палітычна развіты. Тактычна падрыхтаваны. Карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод камандзіраў і байцоў брыгады. У пытаннях Вялікай Айчыннай вайны разбіраецца. Мае здольнасці і схільнасць да камандзірскай работы. Заслугоўвае прысваення звання падпалкоўніка» [1, арк. 311].

Партызанская вайна для былога студэнта гістарычнага факультэта Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага, камбрыга, падпалкоўніка Васілія Афанасьевіча Караткевіча скончылася 29 чэрвеня 1944 г., калі апошні атрад з яго брыгады сустрэўся з войскамі Чырвонай Арміі. Пад яго камандаваннем з мая 1943 па 29 чэрвеня 1944 г. ваявала 604 партызаны, з якіх мужчын налічвалася 552, жанчын – 47 чал. У абсалютнай большасці байцы брыгады з'яўляліся беларусамі – 492 чал., рускіх налічвалася адпаведна – 64, украінцаў – 17, прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей – 26 чал. [6, с. 639 ].

Пасля вайны В. Караткевіч нядоўга працаваў на партыйна-савецкай рабоце. У 1950 г. ён скончыў гістарычны факультэт МДПУ імя М. Горкага і поўнасцю перайшоў на педагагічную работу – да пенсіі працаваў дырэктарам школы.

У дзень 70-годдзя Вялікай Перамогі неабходна ўзгадаць і аддаць даніну памяці і павагі тым, хто сваёй самаахвярнай барацьбой, мужнасцю, гераізмам набліжаў Перамогу. Адным з такіх герояў-партызан з'яўляўся не прафесійны ваенны, а гісторык па адукацыі, былы студэнт гістарычнага факультэта, у гады вайны стаўшы партызанскім камбрыгам, падпалкоўнікам – Васіль Афанасьевіч Караткевіч.

*Літаратура і крыніцы*

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НА РБ). – Ф. 1450. Воп. 8. Спр. 122. Арк. 310 адв.
2. Памяць: Калінкав. р-н: Гіст-дак. Хронікі гарадоў р-наў / [Рэд.-уклад. В. В. Феранц; Рэдкал.: В. І. Пілiпец і інш.]. – Мінск : Ураджай, 1999. – 797 с.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НА РБ). – Ф. 1408. Воп. 1. Спр. 14. Арк. 188.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НА РБ). – Ф. 1450. Воп. 15. Спр. 20. Арк.126.
5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НА РБ). – Ф. 1450. Воп. 15. Спр. 639. Арк. 55. Арыгінал.
6. Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944) : краткие сведения об организационной структуре партизанских соединений, бригад (полков), отрядов (батальонов) и их личном составе / А. Л. Манаенков и др.; Ин-т истории партии при ЦК КП Белоруссии; ф-л Института марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. – Минск : Беларусь, 1983 . – 763 с.

*Summary*

*The article is dedicated to the memory of Vasilij Korotkevich, the former student of the history faculty of Minsk Pedagogical Institute named by M. Gorky who during Great Patriotic War was one of the founder and organizer of wide patriotic and partizan movement against German's occupation in Belarus. The author points out that V.Korotkevich struggled and command actively and effectively of the partisan brigade, himself was a brave and courageously partizan. He was rawarded withmany state medals for his struggle against German's occupants during the Great Patriotic War.*

Паступіў у рэдакцыю 07.04.2015 г.

---

*УДК 94(476)«1941/1944»:002.2*

***С. В. Стельникович,***
*кандидат исторических наук, докторант кафедры истории и этнополитики Национального педагогического университета им. М. П. Драгоманова*

## СОВЕТСКАЯ ПОДПОЛЬНАЯ ПЕРИОДИКА НА ТЕРРИТОРИИ ГЕНЕРАЛЬНОГО ОКРУГА «ЖИТОМИР» (1941–1944 гг.)

В период Великой Отечественной войны с целью тотального использования местного хозяйственно-экономического потенциала и эксплуатации «трудовых ресурсов» захваченные нацистами украинские земли были разделены на несколько оккупационных административно-территориальных единиц, среди которых рейхскомиссариат «Украина». Без учета этнической специфики и культурно-исторических особенностей в пределах рейхскомиссариата «Украина» был выделен генеральный округ «Житомир». В его состав, наряду с территориями Житомирской и большей части Винницкой областей Украинской ССР, были включены большинство территорий Полесской и юго-западная часть Гомельской областей Белорусской ССР. Важной особенностью этих земель стало активное развитие советского партизанского движения и партийного подполья, что уже со второй половины 1942 г. привело к разрушению местной гитлеровской администрации в отдельных, в первую очередь – северных, украинских и белорусских районах округа.

В рамках всестороннего изучения жизни местного населения в условиях нацистской оккупации, в том числе исследования советского партизан-

Рэпазіторый БДПУ